## Білет 13

**Практычнае заданне.**
**Партызанскі рух і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Як называўся орган, створаны для кіраўніцтва партызанскім рухам у тыле праціўніка?
2. Якія метады барацьбы рэкамендавалася выкарыстоўваць партызанам?
3. Аб выкананні якой задачы, што стаяла перад партызанамі, сведчыць картасхема?
4. Прывядзіце тры аргументы, якія пацвярджаюць вывад: «Партызанскі і падпольны рух у тыле праціўніка быў важным фактарам перамогі СССР у Вялікай Айчыннай вайне».

**I. З Пастановы Дзяржаўнага Камітэта Абароны** *(30 мая 1942 г.)*

1. У мэтах аб'яднання кіраўніцтва партызанскім рухам у тыле праціўніка і для далейшага развіцця гэтага руху стварыць пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання Цэнтральны Штаб Партызанскага Руху. <…>

3. У сваёй практычнай дзейнасці па кіраўніцтве партызанскім рухам Цэнтральны Штаб Партызанскага Руху павінен зыходзіць з таго, што асноўнай задачай партызанскага руху з'яўляецца дэзарганізацыя тылу праціўніка:

а) разбурэнне камунікацыйных ліній праціўніка (падрыў мастоў, псаванне чыгуначных шляхоў, арганізацыя крушэнняў цягнікоў, нападзенне на аўтамабільны і конны транспарт праціўніка);

б) разбурэнне ліній сувязі (тэлефон, тэлеграф, радыёстанцыі);

в) знішчэнне складоў, боепрыпасаў, амуніцыі, паліва і харчавання;

г) нападзенне на штабы і іншыя вайсковыя ўстановы ў тыле праціўніка;

д) знішчэнне матэрыяльнай часткі на аэрадромах праціўніка;

е) інфармаванне частак Чырвонай Арміі аб размяшчэнні, колькасці і перамяшчэннях войскаў праціўніка.

**II. Аб партызанскім руху на акупіраванай тэрыторыі БССР** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны”)*

374 тыс. партызан і звыш 70 тыс. падпольшчыкаў вялі барацьбу на акупаванай ворагам тэрыторыі. Усяго за тры гады гераічнай і цяжкай барацьбы ў тыле ворага беларускія партызаны і падпольшчыкі знішчылі больш за 500 тыс. гітлераўцаў, разграмілі 29 чыгуначных станцый, 948 штабоў і гарнізонаў, пусцілі пад адхон 11 128 эшалонаў і 34 бронецягнікі праціўніка; збілі і спалілі на аэрадромах 305 самалётаў, падбілі 1355 танкаў і бронемашын, знішчылі 939 ваенных складоў. Пад канец 1943 г. 60% тэрыторыі рэспублікі знаходзілася пад партызанскім кантролем.

Па сваіх маштабах, ваенных і палітычных выніках рух супраціўлення акупантам у БССР набыў стратэгічнае значэнне, ператварыўся ў адзін з буйных фактараў разгрому ворага, а Беларусь да гэтага часу называюць «партызанскай рэспублікай».

## III. «Рэйкавая вайна» на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1943–1944 гг.)

